УДК 94 (476.5):338.48-6:7/8(476.5)

***Андрэйчык К. В.***

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук,
прафесар Дук Д. У.

# ІНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАЦЭСАЎ ЗАХАВАННЯ ПАМЯЦІ ПРА ПАДЗЕІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫНАЙ ВАЙНЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991–2017 гг.)

У артыкуле разгледжана пытанне інстытуцыяналізацыі працэсаў захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчынай вайны ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2017 гг.). Азначаны перыяд не толькі колькаснага і якаснага росту даследаванняў па акрэсленай тэматыцы, але і час інтэнсіфікацыі трансляцыі назапашаных раней ведаў, мемарыялізацыі важных аб'ектаў ваеннай гісторыі, працэсаў іх рэгенерацыі і ўключэння ў сацыяльныя працэссы праз культурна-асветніцкую і турысцка-экскурсійную дзейнасць.

*Ключавыя словы:* інстытуцыяналізацыя, захаванне памяці, Вялікая Айчыная вайна, мемарыялізацыя, ваенная гісторыя.

in the article the question of institutionalization of the process of preserving memory about events of the great Patriotic war in the Republic of Belarus (1991–2017). This period is not only quantitative and qualitative growth of the research are outlined the topics and time of intensification broadcast previously accumulated knowledge, memory are important objects of military history, the processes of regeneration and social inclusion in processi through cultural, educational and tourist activities.

*Keywords:* institutionalization, the preservation of the memory of the Great Patriotic war, memorialization, military history.

**Уводзіны.** Пытанні вывучэння і захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчынай вайны мелі вялікае значэнне ў сферы грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў пасляваенныя часы і не страцілі сваёй актуальнасці і на сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці і грамадства. Перыяд станаўлення і развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь, які пачаўся ў 1991 г., – гэта перыяд не толькі колькаснага і якаснага росту даследаванняў па акрэсленай тэматыцы, звязаны са знікненнем пэўных палітычных і ідэалагічных абмежаванняў, але і час інтэнсіфікацыі трансляцыі назапашаных раней ведаў, мемарыялізацыі важных аб'ектаў ваеннай гісторыі, працэсаў іх рэгенерацыі і ўключэння у сацыяльныя працэссы праз культурна-асветніцкую і турысцка-экскурсійную дзейнасць. Фарміраванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны сёння з'яўляецца прыярытэтным накірункам заканадаўства і палітыкі беларускай дзяржавы ў галіне культуры і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Перыяд з 1991 па 2017 гг. для айчыннай гістарычнай навукі характарызуецца істотнымі дасягненнямі, якія раскрылі шэраг праблем. Навукоўцаў цікавяць такія малавывучаныя аспекты як гісторыя штодзённасці на акупіраваных тэрыторыях, канкрэтныя ваенныя аперацыі, і іх значэнне, палітыка генацыду, патрыятычны рух моладзі, роля царквы і касцёла, камсамольска-маладзёжнага падполля і інш. Пашырэнню назапашанай навукоўцамі новай гістарычнай інфармацыі спрыяюць дзяржаўныя мэтавыя праграмы, выдавецкая і турысцка-экскурсійная дзейнасць. Пытанні захавання памяці аб падзеях таго часу трапляюць у поле зацікаўленнасці заканадаўчых і выканаўчых органаў беларускай дзяржавы. Шырокае традыцыйнае святкаванне юбілейных дат з'яўляецца магутным штуршком для абуджэння навуковых пошукаў у гэтай сферы, мемарыялізацыі памятных месцаў, музеефікацыі асобных тэрыторый, апублікавання невядомых раней крыніц, уключэння аб'ектаў ваеннай гісторыі у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і інш. Усе пералічанае садзейнічае фарміраванню гістарычнай памяці і пераемнасці пакаленняў, што выступае праявай духоўнай сталасці і стабільнасці беларускага грамадства.

**Асноўная частка.** На дзяржаўны ўзроўні на пачатку 1990-х гг. пытаннямі падтрымання ў належным стане матэрыяльных сведчанняў падзей Вялікай Айчынай вайны займалася Камісія па адукацыі, культуры і збераэжэнні гісторычнай спадчыны пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь. У кампетэнцыю Камісіі ўваходзілі пытані падрыхтоўкі і карэктыроўкі законапраектаў у справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны, выдзялення сродкаў на рэстаўрацыю, размеркавання ганаровых дзяржаўных узнагарод, вызначэння дзяржаўных святаў і знамянальных дат, а таксама вынясенне на абмерванне і канчатковае зацвярджэнне Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь шматлікіх пытанняў інстытуцыянальнага афармлення гістарычнай памяці.

21 снежня 1992 г. Саветам Міністраў была прынята Пастанова №763 "Аб увекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў". У ёй былі вызначаны паўнамоцтвы дзяржаўных органаў у гэтай сферы, механізмы арганізацыі пошукавых работ, статус месцаў пахавання, фінансавыя аспекты і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне мерапрыемстваў па ўвекавечанні памяці абаронцаў айчыны і ахвяр войнаў, адказнасць за парушэнне заканадаўства па гэтым пытанні і інш. Савет Міністраў вызначаў кірунак дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы, а менавіта – зацвярджаў дзяржаўныя праграмы па ўвекавечанні памяці аб загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах войнаў, а таксама ажыццяўляў кантроль за іх рэалізацыяй. У адпаведнасці з Пастановай ў снежні 1992 г. было ўтворана Упраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь [1]. 30 лістапада 1994 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 231 "Аб паляпшэнні работы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў у Рэспубліцы Беларусь" кіраванне гэтымі пытаннямі было перададзена ў Міністэрства абароны. Сярод задач Упраўлення былі наступныя: арганізацыя і каардынацыя работы дзяржаўных органаў, дзяржаўных і іншых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян па ўвекавечанні памяці аб загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах войнаў; распрацоўка сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі дзяржаўных праграм па ўвекавечанні памяці аб загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах войнаў; распрацоўка ведамасных нарматыўных прававых актаў; рэгістрацыя пахаванняў замежных вайскоўцаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь; правядзенне архіўна-даследчых работ па зборы інфармацыі аб няўлічаных воінскіх пахаваннях; ўстанаўленне дадзеных аб загінуўшых, выяўленых пры правядзенні палявых пошукавых работ; удзел у падрыхтоўцы праектаў міжнародных дагавораў у ваенна-мемарыяльнай сферы і іх рэалізацыі; арганізацыя дзейнасці спецыялізаванай пошукавай вайсковай часткі, правядзенне палявых пошукавых работ, вядзенне аўтаматызаванага банка даных "Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь";

разгляд зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб па пытаннях ўстанаўлення дадзеных аб загінулых падчас войнаў і інш. [2]

Працягам гэтай заканадаўчай ініцыятывы стала прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 1994 года № 231 "Аб паляпшэнні работы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў у Рэспубліцы Беларусь". У адпаведнасці з ім 1 сакавіка 1995 г. была утворана спецыялізаваная пошукавая вайсковая частка ў структуры Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. Пры абласных выканаўчых камітэтах былі ўтвораны спецыялізаваныя структурныя падраздзяленні па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў.

Актывізацыі працы ў гэтай сферы спрыяла святкаванне ў 1994 г. 50-гадовага юбілея вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

захопнікаў. Так, Пастановай "Аб увекавечванні памяці ахвяр лагера смерці "Трасцянец" / 1942–1944 гг." у сувязі з набліжэннем 50-й гадавіны вызвалення Беларуі і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пастанавіў абвясціць 1994 г. годам памяці ахвяр вайны і генацыду, ачышчэння ад насілля і жарстокасці, годам грамадзянскага прэмірэння і згоды у краіне дзеля станаўлення дэмакратычнай, незалежнай, нейтральнай і без'ядзернай Рэспублікі Беларусь як гаранта існавання кожнага яе грамадзяніна. Планавалася стварыць на тэрыторыі былога лагера смерці "Трасцянец" мемарыяльную гісторыка-ахоўную зону з музеем, комплексам помнікаў гісторыі, полем памяці ахвяр вайны і генацыду. Міністерству замежных праў, Міністерству культуры, Камітэту дзяржаўнай бяспекі, Міністэрству унутраных спраў, Міністэрству інфармацыі, Нацыянальнаму архіву Рэспублікі Беларусь, Акадэміі навук Беларусі дaручалася скаардынаваць сваю дзейнасць па выяўленні ў архівах Беларусі і на аснове міждзяржаўнага супрацоўніцтва у архіўных зборах краін свету матэрыялаў і дакументаў, звязаных з існаваннем у 1942–1944 гг. лагера смерці "Трасцянец", а таксама прыняць меры па іх вывучэнні, папулярызацыі, выпуску друкаваных матэрыялаў, відэапрадукцыі, стварэнню філіяла музея Вялікай Айчыннай Вайны і вядзенні іншай асветніцкай працы сярод грамадзян" . Аднак гэтыя планы былі рэалізаваныя не адразу і занялі амаль 20 год. Першая спроба ўвекавечвання гэтага аб'екта адбылася яшчэ ў 1963 г., аб'ект набыў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці толькі ў 2007 г. Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу запатрабавала немалых фінансавых укладанняў: толькі на першым этапе патрабавалася каля 4 млн. еўра. Нарэшце, 22 чэрвеня 2015 г., у дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны, на тэрыторыі мемарыяла адбылося адкрыццё кампазіцыі "Брама памяці" [3, л. 45].

Інстытуцыяналізацыя працэсаў захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчынай Вайны ў 1990-я гг. адбывалася і ў рамках агульнай палітыкі ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны. Так, 13 лістапада 1992 г. Вярхоўны Савет прыняў закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны". У адпаведнасці з артыкулам 13, пункт 1.3. "Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці", да іх ліку адносіліся курганныя і грунтавыя могільнікі, асобныя пахаванні, некропалі, маўзалеі і іншыя пахаванні" вырашаліся пытанні надання ахоўнага статуса месцам масавага знішчэння людзей, вайсковым могілкам, пахаванням Героя̆ў Савецкага Саюза, брацкім магілам. Гэтаму этапу папярэднічала даследчая дзейнасць (апытанне сведак тых падзей, праца ў архівах) [4].

У адрас Камісіі па адукацыі, культуры і зберажэнню гісторычнай спадчыны пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь у той час паступалі і звароты ад грамадскасці, навуковых устаноў з прапановамі уключэння пэўных тэрыторый або памятных мясцін у Дзяржаўны спіс гісторыка-кльтурных каштоўнасцей. Так, напрыклад, у 1993 г. Савет Міністраў абвясціў месцы масавага знішчэння людзей Масюкоўшчына, Малы Трасцянец, Курапаты аб'ектамі, што атрымалі статус гісторыка-культурных каштоўнасцей [5, л. 6].

Культурна-асветніцкая і турыстска-экскурсійная дзейнасць у гэтай сферы асабліва актывізуецца да знамянальных і памятных дат. У 1992 г. Міністэрства адукацыі і навукі арганізавала Усебеларускую турысцка-краязнаўчую экспедыцыю "Наш край". У 1995 г. з нагоды 50-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачала сваю дзейнасць рэспубліканская асацыяцыя пошуку і ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў вайны "Пошук". У выніку яе даследчай працы былі адкрыты сотні іменаў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі, адкрыты помнікі. У 1993 г. у сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 50-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Вярхоўным Саветам быў зацверджаны план на рэстаўрацыйныя работы на наступных аб'ектах: мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", "Хатынь", Курган Славы. За час эксплуатацыі комплексаў па прычыне павышанай вільготнасці і перападу тэмператур інжынерныя збудаванні, плітачнае пешаходнае пакрыццё прыйшлі у занядбалы стан. Толькі дзякуючы дадатковаму фінансаванню у памеры 1560 млн рублёў удалося адрамантаваць гэтыя месцы памяці [5, л. 6].

9 лютага 1996 г. Пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь №85 "Аб паляпшэнні работы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў" была замацавана распрацоўка і зацвяржэнне Рэспубліканскіх праграм па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў тэрмінам дзеяння на два гады кожная. Дакумент прадугледжваў наступныя накірункі дзейнасці: правядзенне і забеспячэнне пошукавых работ спецыялізаванымі вайсковымі падраздзяленнямі, гісторыка-архіўныя пошукі, стварэнне аўтаматызаванага банка дадзеных і інш. Ён жа вызначаў крыніцы і а'бёмы фінансавання з дзяржаўнага бюджэту, адказных выканаўцаў і кантралюючыя органы. Так, арганізацыяй і правядзеннем пошукова-даследчых мерапрыемстваў займаліся Міністэрства абароны сумесна з Камітэтам Дзяржаўнай Бяспекі, Міністэрствам замежных спраў. Правядзенне мерапрыемстваў па прапагандзе подзвігаў абаронцаў Айчыны ускладалася на Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, абласныя, раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты. Мерапрыемствы па рэалізацыі Рэспубліканскай праграмы на пэўны год ажыццяўляліся ў межах асігнаванняў, прадугледжаных рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі. Так напрыклад, на капітальны рамонт мемарыяльнага комплексу "Прарыў" (Ушацкі раён Віцебскай вобл.) ў адпаведнасці з Праграмай у 2000–2001 гг. прадугледжвалася патрацiць 500 тыс. руб. з рэспубліканскага бюджэта і 750 тыс. руб. асігнаванняў з мясцовага бюджэта [6].

**Колькасныя пакзчыкі грашовых выдаткаў на рэалізацыю рэспубліканскіх праграм па увекавечванню памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны (2000–2009 гг.) [7]**

| Перыяд | Колькасць мерапрыемстваў | Сродкі на рэалізацыю рэспубліканскіх праграм | |
|---|---|---|---|
| | | мясцовыя бюджэты, тыс. руб. | рэспубліканскі бюджэт, тыс. руб. |
| 2000-2001 | 59 | 31 535 | 80 000 |
| 2002-2003 | 34 | 74 400 | 174 400 |
| 2004-2005 | 44 | 13 471 | 270 000 |
| 2006-2007 | 24 | Па меры фарміравання бюджэта | 390 000 |
| 2008-2009 | 22 | Па меры фарміравання бюджэта | 483 000 |

Аналізуючы прыведезныя паказчыкі можна падсумаваць, што колькасць выдаткаў з рэспубліканскага бюджэта з кожнай новай праграмай павялічвалася, што было абумоўлена інфляцыяй. Сродкі на рэалізацыю рэспубліканскіх Праграм па увекавечванню памяці абарнацаў Айчыны і ахвяр вайны з 2006 г. планаваліся з мясцовых бюджэтаў па меры іх фарміравання.

Архіўныя крыніцы змяшчаюць цікавыя звесткі аб абмеркаванні пытання зацвярджэння рэспубліканскіх святаў у афіцыйным календары краіны – Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Абаронца Айчыны і Узброеных сіл. На паседжанні Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны ад 4 лютага 1994 г. абмяркоўвалася прапанова сакратара камісіі Цумарава Я.А.: аб'яднаць святкаванне 23 лютага і 3 ліпеня у адзін дзень і назваць яго Дзень вызвалення Беларусі і абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь з наданнем статуса святочнага і нерабочага дня. За дадзеную прапанову прагаласавала 9 членаў камісіі, 1 выказаўся супраць. Разам з тым паступіла прапанова аб устанаўленні у рэспубліцы Дня Узброеных Сіл 16 ліпеня – у гонар першага парада партызан і адзначыць яго як Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл РБ. Аднак дадзеныя прапановы Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь адхіліў [8, л. 67].

Значная праца ў гэтай сферы праводзілася сілавымі ведамствамі краіны. Так 9 жніўня 1996 г. загадам міністра абароны Рэспублікі Беларусь №430 было зацверджана Палажэнне "Аб вахтах памяці, якія праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь з мэтай увекавечання памяці абаронцаў Айчыны". Абапіраючыся на папярэднія нарматыўна-прававыя акты Міністэрствам абароны 9 красавіка 1997 г. быў абвешчаны Загад № 182 "Аб зацвярджэнні і увядзенні ў дзеянне інструкцыі аб парадку правядзення раскопак месцаў баёў, няўлічаных воінскіх пахаванняў і месцаў гібелі абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў у працэсе пошукавай работы з мэтай эксгумацыі астанкаў загінуўшых (памерлых) з наступным іх пахаваннем (перапахаваннем) і ўвекавечаннем". У перыяд з 1996 па 2009 гг. ў рамках выканання галіновых праграм міністэрствам абароны спецыялісты выявілі астанкі 29544 загінулых і памерлых і пазначылі межы воінскіх пахаванняў. У мясцовых выканаўчых і распарадчых органах было пастаўлена на дзяржаўны ўлік 7038 воінскіх пахаванняў. На дзяржаўным уліку ў Рэспубліцы Беларусь на той



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

час знаходзілася 7468 воінскіх пахаванняў розных гістарычных перыядаў, у якіх пахавана больш за 2 млн. загінулых. Звесткі аб амаль 500 тыс. сталі вядомыя і былі ўнесеныя ў пашпарты воінскіх пахаванняў і аўтаматызаваны банк дадзеных "Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь", але месца пахавання больш за 1,5 млн загінулых і дагэтуль невядома [9].

Дзейнасць дзяржаўных органаў адносна наданння аб'ектам статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці з унясеннем (уключэнне былых помнікаў) у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь закранула і помнікі ваеннай гісторыі краіны. Дзяржаўны спіс зацверджаны загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 21 чэрвеня 2007 г. № 141, уключаў гісторыка-культурныя каштоўнасці, статус якім нададзены пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 і ад 3 верасня 2008 г. № 1288. Парадак вядзення Дзяржаўнага спіса быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 762. У адпаведнасці са сваімі ўласцівасцямі матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія ўключаліся ў Дзяржаўны спіс, падзяляліся на чатыры катэгорыі: "0" – гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя або прапанаваныя для ўключэння ў Спіс сусветнай спадчыны (напрыклад, комплекс фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці); "1" – найбольш унікальныя гісторыка-культурныя каштоўнасцю мастацкія, эстэтычныя і дакументальныя вартасці якіх уяўляюць міжнародную цікавасць (напрыклад, Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой"); "2" – выдатныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія характарызуюць найбольш адметныя рысы гісторыка-культурнай спадчыны ўсёй рэспублікі (напрыклад, Мемарыяльны комплекс "Прарыў"); "3" – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія характарызуюць адметныя рысы гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёнаў краіны (брацкія магілы і вайсковыя могілкі, помнікі героям Савецкага Саюзу, мемарыяльныя комплексы і інш.). Напрыклад, толькі па Віцебскай вобласці налічвалася каля 133 брацкіх магіл, 30 вайсковых могілак, 5 помнікаў героям Свецкага Саюза, 7 мемарыялаў. Усе яны маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, 3 катэгорыя, акрамя мемарыяльнага комплексу "Прарыў" (2 катэгорыя), на якім у 2015–2016 гг. была праведзеная адмысловая рэканструкцыя [10].

Традыцыйна асаблівую ўвагу пытанням ваенна-патрыятычнага выхавання надае і Міністэрства адукацыі, і Міністэрства абароны. Згодна з рэспубліканскімі праграмамі па увекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны, якія зацвярджае Міністэртва абароны, на працягу апошніх дзесяцігоддзяў увайшло у практыку правядзенне шэрагу мерапрыемтсваў па прапагандзе подзвіга абаронцаў Айчыны (у т.л. Вахты Памяці, "Зорныя паходы", школьныя ваенна-патрыятычныя клубы, тэматычныя экскурсіі і інш.). Намаганнямі гэтых двух ведамстваў да працы па захаванню памяці аб падзеях вайны прыцягваліся шырокія колы школьнікаў, аб'яднаных у адмысловыя клубы, секцыі і гурткі пры навучальных установах. Напрыклад, аб'ёмная інфармацыйная база была сабрана намаганнямі ваенна-патрыятычнага клуба "Разведчыкі воінскай славы", які пачаў дзейнічаць яшчэ ў 1969 г. пры школе № 2 г. Наваполацка. За перыяд з 1969 г. па 2017 г. была сабрана калекцыя артэфактаў (больш за 2 тыс. экспанатаў) і мемуарных сведчанняў удзельнікаў (больш за 1 тыс. запісаў). У клубе маюцца секцыі экскурсаводаў, юных карэспандэнтаў, архіварыюсаў, агітацыйная брыгада, пошукавы атрад, які прымае ўдзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных Вахтах Памяці. Заснавальнік клуба, настаўнік Я. А. Трапезнікава – ветэран беларускага і міжнароднага пошукавага руху. Вынікам штогадовай даследчай працы і палявых экспедыцый з'яўляецца добраўпарадкаванне месцаў масавых расстрэлаў, правядзенне Вахт Памяці, "Зорных паходаў", пошук і наведванне знішчаных і не адноўленых населеных пунктаў, добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў, удзел у патрыятычных конкурсах творчых выканаўцаў, краязнаўцаў і экскурсаводаў і інш [11, с. 23].

Ваенна-гістарычная і ваенна-патрыятычная тэматыка ў экскурсійнай справе была вельмі папулярна у савецкі перыяд, аднак з цягам часу пачала страчваць свае пазіцыі. Так, калі у 1985 г. зафіксавана 12700 чал., якія наведалі БССР па азначанай тэматыцы, то у 1993 г. 5398 чал. На 2017 г. лічба узрастае і складае 8907 тыс.

Усведамленню ваеннай гісторыі для маладога пакалення эфектыўна спрыяе рэгенерацыя і ўключэнне напамінаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны ў турысцка-экскурсійную дзейнасць. Аб'ектамі паказу выступаюць помнікі, абеліскі, мемарыяльныя комплексы, некропалі, брацкія магілы, асобныя пахаванні, ваенна-інжынерныя збудаванні (равы, акопы, бліндажы, ДОКі і інш.), баявая тэхніка, пастаўленая на пастаменты, ўчасткі мясцовасці – месцы былых бітваў, помнікі фартыфікацыі, музейныя экспазіцыі і інш. і на сённяшні дзень не губляюць сваёй актуальнасці экскурсійныя напрамкі такия як: экскурсія "Дарогай з Мінска ў Брэст", "Дарогай да "Лініі Сталіна", "Лёс абпалены вайной" і інш. [12, с. 43]

Паступовае аднаўленне былых аб'емаў турыстска-экскурсійнага абслугоўвання, якое назіраецца і ў XXI ст., звязана ў першую чаргу з дзяржаўнай палітыкай у сферы грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. Гэтаму спрыяе таксама немалая ўвага да гэтай тэматыкі дзяржаўных органаў і павялічыўшаяся фінансаванне гэтай сферы, аднаўленне і рэстаўрацыя шматлікіх аб'ектаў ваеннай гісторыі. Так, 30 чэрвеня 2005 г. да 60-годдзя Перамогі быў адчынены гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна". У 2004 г. ініцыятыўная група пры дабрачынным фондзе дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам "Памяць Афгана" распрацавала канцэпцыю гэтага комплексу. Быў вызначаны ўчастак мяжы Мінскага умацаванага раёна абароны, які быў найбольш насычаны фартыфікацыйнымі аб'ектамі (агнявыя кропкі, акопы і г.д.). У тым жа годзе пастановай старшыні Мінскага аблвыканкама Н.Ф.Дамашкевіча было падпісана пастанаўленне "Аб музеефікацыі гістарычнага аб'екта "ДАК" (доўгатэрміновая агнявая кропка) пабудовы 1932–1933 гг.". Каля шашы Мінск – Маладзечна ля вёскі Гарошкі адбылося адкрыццё "Музея-ДАКа". У лютым 2005 г. быў нанова абсталяваны ротны ўчастак: супрацьтанкавыя равы розных профіляў, надаўбні, драцяныя загароды, пазіцыі для стралковых аддзяленняў, кулемётная ДАК, тры бліндажы для размяшчэння стралковага ўзвода, акопы для гармат, выстава ваеннай тэхнікі інш. [13, с. 144]

Важнасць працы дзяржавы і грамадскасці ў гэтай сферы асазнаецца і на самым вышэйшым узроўні кіраўніцтва краіны. Так, звяртаючыся з пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага Схода 21 красавіка 2017 г., А. Г. Лукашэнка падкрэсліў, што "…Историческая память – это фундамент патриотизма, основа благородного чувства любви и уважения человека к своему Отечеству. Хорошо известно, к чему может привести забвение исторического прошлого, проверенных веками нравственных ценностей, на которых держится преемственность поколений. Неизбежным следствием подобного пренебрежения к памяти народа является крушение государств и гуманитарные катастрофы, которые приводят к человеческим жертвам, многих трагедий в судьбах людей и целых стран…" [14].

**Заключэнне.** Зменлівыя сацыякультурныя ўмовы развіцця беларускага грамадства апошніх дзесяцігоддзяў вызначаюць новыя падыходы ў фарміраванні каштоўнасных арыенціраў рознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы. Захаванне памяці пра падзеі Вялікай Айчынай вайны, подзвіг беларускага народа з'яўляецца адным з найважнейшых накірункаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання і дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы. Пошук вартых даверу крыніц, праца з архіўнымі дакументамі, сустрэчы з відавочцамі: ветэранамі, вязнямі канцлагераў, падпольшчыкамі, партызанамі, пошукавая дзейнасць усіх узроўняў, фарміруюць тэарэтычную базу ведаў аб ваенных падзеях мінулага. Дзяржаўныя органы праз разпрацоўку і прыняцце нарматыўных прававых актаў, рэалізацыю мэтавых праграм і фарміраванне арганізацыйна-метадычнага забеспячэння ажыццяўляюць актыўную працу па інстытуцыяналізацыі працэсаў захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчынай Вайны. Вывучэнне і захаванне памяці пра падзеі Вялікай Айчынай вайны адбываецца навуковымі, адукацыйнымі і культурнымі ўстановамі пры актыўным удзеле шырокі колаў грамадства. Найбольш массавая пасняховая папулярызацыя падзей Вялікай Айчыннай вайны адбываецца праз мемарыялізацю памятных месцаў і іх уключэння ў турысцка-экскурсійную дзейнасць.

**Літаратура:**


1. Постановление Совета Министров РБ № 763 от 21.12.1992. Об увековечении памяти защитников Отечества и жертв войн [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belzakon.net – Дата доступа: 25.03.2018 г.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Постановление Кабинета Министров РБ № 85 от 09.02.1996. Об улучшении работы по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войн [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belzakon.net – Дата доступа: 25.03.2018 г.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 4051.
4. Закон РБ № 98-З от 09.01.2006. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь[Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belzakon.net – Дата доступа: 25.03.2018 г.
5. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 4055.
6. Постановление Кабинета Министров РБ № 85 от 09.02.1996. Об улучшении работы по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войн [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belzakon.net – Дата доступа: 25.03.2018 г.
7. Постановление Министерства обороны РБ № 10 от 01.03.2004. Об утверждении Республиканской программы по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войн на 2004 - 2005 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belzakon.net – Дата доступа: 25.03.2018 г.
8. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 4056.
9. Работа па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў у Рэспубліцы Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.mil.by/ru – Дата доступа: 25.03.2018 г.
10. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь /склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.: іл.
11. Трапезникова, Е. А. Мы ищем на земле ровестников следы… / Е. А. Трапезникова. – Полоцк : А. И. Судник, 2008. – 171 с.
12. Ганский В. А., Вовнейко Е. В. Экскурсоведение : учебнометодический комплекс для студентов спец. 1-89 01 01 «Туризм и гостеприимство» / В. А. Ганский, Е. В. Вовнейко; под общ. ред. В. А. Ганского. – Новополоцк : ПГУ, 2012. – 254 с.
13. Метла, А. М. «Линия Сталина»: Правда и память истории / А. М. Метла. – Минск : Память Афгана, 2006. – 160 с.
14. Послание белорусскому народу и Национальному собранию [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by – Дата доступа: 21.04.2017 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова